

*Святы мы чакаем з асаблівым настроем, рыхтуемся да іх загадзя, а праляталоць яны як адно імгненне. Вось і першае веснавое свята -- Дзень жанчын ужо адышло. Прагучала шмат цёплых і пяшчотных слоў у адрас самых лепшых, любых, каханых.*

*Урачыста адзначылі Дзень жанчын і ў нашым універсітэце. Заслужаныя, паважаныя ў калектыве выкладчыцы, супрацоўніцы, студэнткі-выдатніцы 6 сакавіка былі запрошаны ў рэктарат ГДУ, дзе іх цёпла павіншавалі са святам кіраўнікі універсітэта, старшыні прафкомаў і жансавета, уручылі ім Ганаровыя граматы, грашовыя прэміі. Шмат добрых слоў у свой адрас пачулі прадстаўніцы лепшай паловы універсітэцкага калектыву і на святочным вечары, які ім прысвячаўся. Добры настрой ім стварылі таксама ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці культурнага цэнтра ГДУ, якія выступілі з канцэртам.*

*Сёння, улічваючы графік выхаду нашай газеты, мы з невялікім спазненнем далучаемся да ўсіх віншаванняў, што прагучалі ў адрас жанчын, і прысвячаем ім асобныя тэматычныя матэрыялы.*


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 5 (943) | Аўторак 10 сакавіка 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|


## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Пры нашым універсітэце працуюць ўжо чатыры спецыялізаваныя Саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Аб выніках іх работы за прайшоўшы перыяд і перспектывах на будучае адбылася размова на чарговым пасяджэнні Савета універсітэта. Заслуханы і абмеркаваны паведамленні старшыняў гэтых спецыялізаваных Саветаў.

Па інфармацыі вучонага сакратара Савета Л.Я.Палякова ўнесены некаторыя змяненні ў Статут ГДУ.

Савет заслухаў прарэктара на навуковай рабоце Д.Р.Ліна аб плане навукова-даследчай работы на 1998 год. Па яго ж інфармацыі зацверджаны тэмы кандыдацкіх дысертацый аспірантам прыёму мінулага года.

Начальнік ІВЦ М.С.Далінскі далажыў Савету аб плане работы інфармацыйна-вылічальнага цэнтра.

На пасяджэнні Савета разгледжаны і вырашаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: доктар фізіка-матэматычных навук **А.М.Сердзюкоў** -- прафесарам кафедры тэарэтычнай фізікі; кандыдат гістарычных навук **В.П.Пічукоў** -- загадчыкам кафедры гісторыі Беларусі.

## УДАСТОЕНА СТЫПЕНДЫІ ПРЭЗІДЭНТА

По рэкамендацыі Савета універсітэта студэнтка V курса спецыяльнасці руская мова і літаратура са спецыялізацыяй беларуская мова і літаратура філалагічнага факультэта Ала Партнова ўдастоена стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

*Увага!*

## СТВАРАЕЦЦА КАРЭСПАНДЭНЦКІ ПУНКТ

На філалагічным факультэце ГДУ пачынае працаваць карэспандэнцкі пункт шматтиражнай газеты "Гомельскі універсітэт". Ён знаходзіцца ў ауд. 2-3 вучэбнага корпуса N1. Яго работай кіруе студэнтка 2-га курса (гр.БА-23) філфака Святлана Каган.

Запрашаем усіх жадаючых да супрацоўніцтва.

## ВІНШУЕМ!

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры матэматычнага аналізу МУХІНА Уладзіміра Васільевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.***

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання КАРАСЁВУ Галіну Леанідаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.***

## КОНКУРС "НАВУКА -- 98"

*Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў аб'яўляе конкурс праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў "Навука -- 98".*

*На конкурс прымаюцца заяўкі навуковых калектываў і асобных вучоных Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на выкананне праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў сумесна з вучонымі замежных краін.*

*Заяўкі на конкурс прадстаўляюцца да 10 красавіка 1998 года.*

*Звесткі аб парадку прадстаўлення заявак можна атрымаць у НДС (п. 2-23, корпус N4, тэл. 57-82-58; п. 5-14, корпус N5, тэл. 56-73-38).*

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дэкан факультэта фізічнай культуры дацэнт **ЗАЙЦАЎ Барыс Макаравіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

Знак памяці

## УСТАНОЎЛЕНА СТЫПЕНДЫЯ ІМЯ АКАДЭМІКА Б.В.БОКУЦЯ

Напрыканцы другога тысячагоддзя наша ВНУ адзначыць свой 70-гадовы юбілей. Для станаўлення і развіцця ГДУ вельмі многае зрабіў былы рэктар доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, акадэмік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Б.В.Бокуць, якога, на жаль, ужо няма ў жывых. Барыс Васільевіч узначальваў універсітэт з 1973 па 1989 год. Яго заслугі перад вядучай вышэйшай навучальнай, навуковай і культурнай установай Беларускага Палесся сёння нельга пераацаніць. І вельмі пахвальна, што выканком партыі народнай згоды, старшынёй якога з'яўляецца былы прарэктар ГДУ па завочнаму навучанню, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Л.Н.Сечка, выступіў з ініцыятывай аб устанаўленні стыпендыі імя акадэміка Б.В.Бокуця. З гэтай нагоды ў зале пасяджэнняў Савета універсітэта адбылося падпісанне адпаведнага дакумента.

На ўрачыстай цырымоніі выступілі рэктар універсітэта член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі Л.А. Шамяткоў і старшыня выканкома партыі народнай згоды Л.Н.Сечка. Яны далі высокую ацэнку Б.В.Бокуцю



як выдатнаму вучонаму, таленавітаму арганізатару навукі, стваральніку гомельскай аптычнай школы і ўсяму таму, што ён зрабіў для другога ў Беларусі дзяржаўнага універсітэта.

У сваім выступленні Л.Н.Сечка падкрэсліў, што стыпендыя імя акадэміка Б.В.Бокуця, памер якой складае тры з паловай мінімальныя заработныя платы і якая будзе выплачвацца дадаткова да вучэбнай стыпендыі, не носіць палітычнага характару. Яе прызначэнне — стымуляваць выдатную вучобу і актыўную навуковую дзейнасць студэнтаў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы Л.Н.Сечка ўручыў для гісторыка-юрыдычнага факультэта і бібліятэкі універсітэта камплект выдадзенай пад яго кіраўніцтвам і выдаўшай нядаўна ў свет кнігі "Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь". За гэты каштоўны падарунак шчырую падзяку Леаніду Нікanоравічу выказаў дэкан названага факультэта дацэнт М.І.Старавойтаў.

Так як акадэмік Б.В.Бокуць па спецыяльнасці быў фізікам, то першую стыпендыю яго імя вырашана назначыць аднаму з лепшых студэнтаў фізічнага факультэта. Сярод іх, як сказаў дэкан С.В.Шалупаеў, нямала такіх, хто дастойны светлай памяці былога рэктара ГДУ, выдатнага чалавека і вучонага.

26 лютага на чарговым пасяджэнні Савета універсітэта новая імянная стыпендыя назначана выдатніку вучобы чацвёртакурсніку фізічнага факультэта Вячаславу Аверчанку.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: Л.Н.Сечка перадае асабісты дар універсітэту.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

Добры кліч

## ВЫПУСКНІКІ, ДАВАЙЦЕ СУСТРАКАЦЦА!



Кожны універсітэт любой цывілізаванай краіны свету ганарыцца сваімі выпускнікамі. І яны з гордасцю гавораць аб сваёй альма-матэр. Усе з радасцю збіраюцца адзін раз у год разам, каб успомніць гады вучобы, выкладчыкаў, сяброў.

У гэтым годзе такая традыцыя з'явілася на кафедры АСАІ фізічнага факультэта. Мы сустрэліся з яе загадчыкам дацэнтам А.М.Дземідзенкам. Вось што ён расказаў:

— Сапраўды, падтрыманне сувязяў з выпускнікамі — гэта адна з частак нашай работы. Пасля таго, як студэнт пакінуў сцены універсітэта, ён нікуды не знік, а проста змяніў месца вучобы на месца працы. Заўсёды прыемна сустракацца з выпускнікамі, радавацца за іх поспехі, дапамагаць у чым-небудзь. Адыходзяць у мінулае дробныя крыўды, праблемы і застаецца самае галоўнае — разуменне таго, што мы выгадавалі Спецыяліста.

Нам, выкладчыкам, без гэтых сустрэч проста нельга. Як інакш можна атрымаць адваротную сувязь і зразумець — ці тых спецыялістаў мы рыхтуем? Што змянілася на прадпрыемствах і ў арганізацыях, як перабудоўваць сваю работу?

У гэтым годзе, у трэцюю суботу лютага, выпускнікі спецыяльнасці АСАІ ўпершыню сабраліся разам. Не прыехалі толькі некалькі чалавек з іншых гарадоў і тыя, хто зараз служыць у арміі.

Неяк самі па сабе ссунуліся разам сталы ў аўдыторыі, з'явіліся чайнік і чашкі, смачны торт. І пайшла размова аб тым, хто дзе, як работа, што новага ў асабістым жыцці. Прыйшлі выкладчыкі. І так прыемна было сустрэцца ўсім нам разам. Было месца і для ўрачыстага слова, і для абмену думкамі. Ну, а асобную частку размовы склалі вясёлыя гісторыі пра камп'ютэры.

Развітваючыся, вырашылі, што новай традыцыі жыць. Дарэчы, час для яе падабралі не выпадкова. У пачатку лютага праходзяць сустрэчы і з выпускнікамі школ. Ёсць падстава тады ўспомніць і пра сваю ВНУ. Было б цудоўна, калі б сустрэчы выпускнікоў на ўсіх факультэтах у нашым універсітэце праводзіліся не ў Дні фізікаў, эканамістаў або матэматыкаў, а каб было вялікае агульнае свята — Дзень сустрэчы выпускнікоў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

А ваша меркаванне — Савет універсітэта?



А таленты — побач

**Бывае так у жыцці — чалавек можа нават не здагадвацца, якія магчымасці закладзены ў яго асобе. Нездарма ж навука сцвярджае, што чалавек выкарыстоўвае толькі некаторую частку свайго творчага патэнцыялу, а астатняя можа застацца незапатрабаванай да канца яго жыцця. А вось гэтым дзвюм дзяўчынам, гаворка аб якіх пойдзе ніжэй, лёс падараваў шчаслівы шанс: яны змаглі адкрыць у сабе сваё творчае "я".**



## "ТЭАТР — МАЁ ЗАХАПЛЕННЕ"

Універсітэцкі тэатр-студыя "Если бы..." не так даўно трымаў сур'ёзны экзамен: пастаноўкай па п'есе В.Ткачова "Шкірдзюкі займаюць абарону" даказваў сваё права на атрыманне звання народнага калектыву. Аўтарытэтная камісія, якая прымала спектакль, высока ацаніла работу студыйцаў на чале з рэжысёрам Г.І.Варонінымі. Але, нікольki не змяншаючы заслуг кожнага самадзейнага акцёра, усё ж асобна адзначыла вельмі каларытную гульню Святланы Карчэўскай, якая выконвала ролю бабы Ваверкі. І сам аўтар п'есы Васіль Ткачоў шчыра прызнаўся, што яна надзвычай дакладна змагла ўвасобіць на сцэне задуманы ім вобраз. Ды і па рэакцыі гледачоў было відаць, як спадабалася ім Святлана ў гэтай ролі.

У названы творчы калектыў Святлана Карчэўская прыйшла выпадкова са сваёй аднакурсніцай Наталляй Корхавай, якая займалася ў студыі з самага пачатку яе стварэння. Ёй вельмі захацелася паглядзець, як, па словах сяброўкі, тут робяць інсцэніроўкі невялікіх жартоўных мініяцюр, героямі якіх з'яўляюцца не людзі, а неадушаўлёныя прадметы. Убачыла ўсё гэта і засталася ў тэатры. Працавала над ролямі, якія ёй прапаноўвалі, з цікавасцю, з ахвотай, спасцігаючы ўсе азы тэатральнай гульні — пластыку, міміку...

Першая роля ў жарце Ф. Аляхновіча "Чорт і баба" у яе атрымалася, дзякуючы падказкам рэжысёра, назіранням за паводзінамі састарэлых людзей, успамінам аб сваёй бабулі. Потым быццам прачнулася сваё, уласнае бачанне роляў у далейшых пастаноўках: у "Аўцюкоўцах" паводле аднайменнай кнігі У.Ліпскага, у тых жа "Шкірдзюках...". А яшчэ вельмі дапамог шмат чаго раскрыць у сабе ўдзел у Міжнародным фестывалі сатыры і гумару на Палессі, у якім удзельнічаў і тэатр-студыя "Если бы...". На ім Святлана разам з Д.Жыхаравым прадстаўляла калектыў у конкурсе інсцэніраванай байкі. Сама атмасфера фестывалю, раскаваная, напоўненая невычэрпным гумарам, непасрэднымі кантактамі з гледачамі, якія кідалі свае рэплікі, жарты, дабаўляла ў інсцэніроўку імправізацыю, экспромт, жывую, імгненную рэакцыю ў адказ. Вось дзе змагла праявіць сябе творчая натура дзяўчыны. Нездарма тады ў названым конкурсе Святлана разам са сваім партнёрам заняла другое месца, атрымала дыплом фестывалю і каштоўны прыз.

Цяпер тэатр для С.Карчэўскай, чацвёртакурсніцы філалагічнага факультэта, — нешта значна большае, чым проста захапленне. Яна аддае яму ўсю сваю душу, талент і не можа ўявіць сябе далей без яго.

— Вельмі важна, — гаворыць Святлана, — займацца ў жыцці любімай справай, тады атрымліваеш ад яе сапраўднае задавальненне. А калі бачыш добры вынік, што гледачу падабаецца твая гульня, хочацца яшчэ лепш працаваць.

... Закончыцца студэнцкае жыццё ва універсітэце, але, па шчыраму прызнанню Святланы, будзе працягвацца яе захапленне сцэнай, тэатрам.



**Тэатр, па словах К.Станіслаўскага, пачынаецца з вешалкі.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## "ЛЮБЛЮ СПЯВАЦЬ"...

... Яе моцны, прыгожы голас вёў за сабой, да марскога ўзбярэжжа, дзе вее свежасцю і прахалодай ад блакітных хваль, туды, дзе жыве самая прыгожая дзяўчына ў свеце.

Так, цяпер вядомая ўсім песня У.Кузьміна "Сімона", якую Таццяна Кручко выканала на фестывалі маладзёжнай песні, што праходзіў у нашым універсітэце ў канцы мінулага года, стала яе своеасаблівай візітнай карткай. І самы галоўны яго прыз — "Гран-пры" журы аднагалосна прысудзіла не каму іншаму, а менавіта ёй.

Такім чынам пяцікурсніца беларускага аддзялення філалагічнага факультэта Т.Кручко, якая ўпершыню ў сваім жыцця адважылася выйсці на сцэну, упэўнена заявіла аб сабе.

За ўсе гады вучобы ва універсітэце колькі канцэртаў, конкурсаў магла ўбачыць Таццяна на сцэне актавай залы ГДУ, а сябе на ёй ніяк не магла ўявіць. Патрэбен быў нейкі штуршок для гэтага ці шчаслівы выпадак.

А спявае Таня з таго часу як сябе памятае. Любімым месцам для "заняткаў вакалам" быў у кватэры... ванны пакой.

Гучыць банальна, але ў рэальнасці шчаслівая выпадковасць змяніла многае ў жыцці Т.Кручко. Іра Барысенка, з якой яна разам вывучае дадатковую спецыяльнасць "Псіхалогію", убачыла ва універсітэце аб'яву аб мяркуемым фестывалі песні.



— Паспрабуй сябе і ты, — параіла яна сяброўцы.

Вынік спробы вам ужо вядомы — поспех, прызнанне. Але Таццяна дзеліць яго і са сваімі выдатнымі памочнікамі, якія дапамагалі ёй рыхтавацца да конкурсу, — кіраўніком фальклорнага ансамбля ГДУ Анжэлай Эбзеевай і гукааператарам Раманам Камандзірчыкам.

— Мяне не хвалявала, якое месца я займу ў конкурсе, галоўнае для мяне было ў ім удзельнічаць, каб раскрыць сябе, спазнаць свае сілы, адчуць рэакцыю залы. Цяпер у мяне з'явілася ўпэўненасць у лепшым сэнсе слова.

У песнях, якія ўключае ў свой рэпертуар Таццяна,выдатны сінтэз музыкі і слоў. Яны, на думку дзяўчыны, могуць закрануць самыя патаемныя куточкі душы чалавека, не пакінуць яго раўнадушным. Песень такіх шмат, і лірычных, і з хуткім бадзёрым рытмам. Таццяна спявае тую ці іншую з іх у адпаведнасці ад уласнага настрою.

Першая творчая спроба Т.Кручко аказалася надзвычай удалай. Няхай будзе ў яе жыцці яшчэ шмат такіх момантаў, якія акрыляюць, надаюць сілы.

***

**Той, хто хоць аднойчы адчуў магічную сілу сцэны, з якой прыемна дарыць радасць, ствараць добры настрой гледачам, будзе выходзіць на яе зноў і зноў.**

**Т.ДУБЯК.**

**Культура**

## У РАГАЧОЎ, НА ФЕСТЫВАЛЬ

Думаецца, што любы творчы калектыў з радасцю ўспрымае запрашэнні на розныя фестывалі, агляды талентаў. Удзел у іх — гэта дадатковая магчымасць паказаць свае здольнасці, адшліфаваць майстэрства, ды і ў іншых калектываў многаму павучыцца.

Універсітэцкі тэатр-студыя “Если бы ...”, якім кіруе рэжысёр Г.І.Варонін, ужо мае пэўны вопыт удзелу ў такіх мерапрыемствах. Ён двойчы выдатна выступіў на Усебеларускіх фестывалях народнага гумару ў в.Вялікія і Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна, дзе стаў дыпламантам і прызёрам. Цяпер жа самадзейны студэнцкі калектыў актыўна рыхтуецца да свайго выступлення ў г.Рагачове. Там у пачатку красавіка адбудзецца I абласны фестываль маладзёжных тэатраў мініяцюр, які будзе насіць назву “Рукой падаць”. На яго яны і атрымалі запрашэнне.

Выдатна ведаюць, вельмі любяць гледачы і яшчэ адзін калектыў нашага універсітэта — студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр “СанТэхЭлектраМантаж”, кіраўніком якога з’яўляецца Ю.І.Капоця. Ён таксама пакажа сваё майстэрства на названым фестывалі.

Пажадаем жа ім творчых поспехаў!

## МУЗЫКА — СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

Не сакрэт, што музыка не пакідае чалавека на працягу ўсяго жыцця. Гучыць яна, чыстая і светлая, або цяжкая і не кожнаму зразумелая, гучыць, каб прыносіць нам цеплыню і спакой. І ўсе мы, як да сонца, цягнемся да музыкі, аднаго з лепшых вынаходніцтваў чалавека.

Нядаўна універсітэт вітаў у сваіх сценах сімфанічны аркестр г.Гомеля. Такое культурнае супрацоўніцтва музыкантаў аркестра і студэнтаў адбылося ўпершыню. Але, як зазначыў рэктар ГДУ Л.А.Шамяткоў, які таксама прысутнічаў на канцэрце, сустрэча не апошняя, і выказаў спадзяванне, што імпрэзы такога кшталту будуць праводзіцца сістэматычна.

Музыканты аркестра (дырыжор В.Краўцоў) падрыхтавалі спецыяльную праграму менавіта для першай сустрэчы са студэнтамі. Прагучалі творы І.Баха, мелодыі Г.Свірыдава і іншых кампазітараў.

Выконвалася таксама народная музыка, гучалі песні ў выкананні выкладчыц каледжа мастацтваў імя Н.Сакалоўскага.

Сустрэча працягвалася амаль паўтары гадзіны, але неяк незаўважна прабег час. Засталіся шчырыя і добрыя ўражанні ад канцэрта і надзея на тое, што адбывацца такія імпрэзы будуць часцей. Бо музыка заўсёды сагрэе і прынясе нешта новае ў нашае жыццё.

**Аксана ТУСІКАВА,**
**студэнтка гр.БА-34 філалагічнага факультэта.**

## ПА ТВОРАХ БУЛАТА АКУДЖАВЫ

Нечакана пайшоў з жыцця папулярны паэт, кампазітар і выканаўца ўласных песень Булат Акуджава. Але і цяпер у яго вельмі шмат прыхільнікаў. Аб гэтым засведчыў і вечар, які адбыўся 24 лютага ў актавай зале нашага універсітэта і быў прысвечаны яго творчай дзейнасці. На працягу дзвюх гадзін гледачы, як кажуць, не пераводзілі дыханне. З выключнай увагай яны слухалі прозу і песні на вершы і музыку знакамітага прадстаўніка вялікага Мастацтва.Папулярныя песні выконваліся ў асноўным універсітэцкімі бардамі.

У тым, што канцэрт прайшоў з поспехам і стаў знамянальнай падзеяй у культурнам жыцці, значная заслуга мастацкага кіраўніка культурнага цэнтра ГДУ Марыны Шырынкінай.

## ПЕРСАНАЛЬНАЯ ВЫСТАВА МАСТАКА

У выставачнай зале галоўнага корпуса нашага універсітэта ў другі раз знаёміць гледачоў са сваёй творчасцю малады гомельскі мастак Аляксандр Кручковіч. Ён прадставіў свой жывапіс.

Нагадаем, што Аляксандр у мінулым годзе двойчы прадстаўляў свае работы на выстаўках у Германіі.

Камп’ютэрызацыя

## ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ, СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ



Намаганнямі нашых спецыялістаў завершаны асноўныя работы па стварэнню **адзінай** карпаратыўнай камп’ютэрнай сеткі універсітэта.

Сучасная камп’ютэрная сетка, заснаваная на тэхналогіі intranet, звязвае ўсе карпусы ГДУ і ўключае звыш 60 камп’ютэраў. Яе карыстальнікамі з’яўляюцца сотні супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

**Калі вы падключыцеся да сеткі, то атрымаеце доступ:**

— да сістэмы карпаратыўнай электроннай пошты ГДУ, абанентамі якой ужо сёння з’яўляюцца каля паўтары сотні структурных падраздзяленняў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта;

— з карпаратыўнай пошты да Internet - E - mail, якая дазваляе абменьвацца электроннай поштай з адрасатамі ў сетцы Інтэрнет (на платнай аснове з разліку 300 руб. за і К прыему/перадачы (грошы ўносяцца ў касу ГДУ і выкарыстоўваюцца на пакрыццё расходаў на перасылку);

— да пастаянна растучай колькасці універсітэцкіх электронных канферэнцый, прысвечаных абмеркаванню розных прафесіянальных і вучэбных пытанняў, а таксама, пры жаданні будзе магчымасць правядзення новых канферэнцый, адпавядаючых вашым інтарэсам;

— да WWW-сервера ГДУ, а таксама магчымасць размяшчэння WWW-старонак структурных падраздзяленняў і іх супрацоўнікаў на WWW-серверы;

— да розных дыстрыбутываў, якія захоўваюцца на серверах сеткі; рэгулярнае забеспячэнне свежымі версіямі антывірусных праграм.

**Вы атрымаеце магчымасць:**

— аператыўнай устаноўкі неабходнага праграмнага забеспячэння;

— выкарыстання карпаратыўнай электроннай пошты для атрымання інфармацыі аб усіх новаўвядзеннях у сетцы і аператыўнай тэхнічнай падтрымкі з боку абслугоўваючага персаналу ІВЦ.

Інфармацыйна-вылічальны цэнтр ГДУ працягвае працаваць над падтрыманнем функцыяніравання, павелічэннем колькасці карыстальнікаў і пашырэннем магчымасцей сеткі. У перспектыве плануецца падключэнне да сеткі ўсіх камп’ютэраў ГДУ, аб’яднанне яе з Інтэрнет, стварэнне сеткавай факсавай службы, якая дасць магчымасць адпраўляць і прымаць факсы, выкарыстоўваючы праграмнае забеспячэнне карпаратыўнай электроннай пошты і інш.

**М.ДАЛІНСКІ,**
**начальнік ІВЦ ГДУ.**



*Вольны час у інтэрнаце*

## АДПАЧЫНАК З КАРЫСЦЮ

Цікава адзначылі свята абаронцаў Айчыны і 80-годдзе Узброеных Сіл Беларусі ў інтэрнаце N1. Тут адбыўся вечар-агеньчык, прысвечаны гэтай даце.

Група актывістаў прапанавала гасцям захапляльную праграму, якую адкрылі выступленні-пародыі зорак расійскай эстрады — Алы Пугачовай (Т.Петрунько з гр. Б-22) і Ірыны Алегравай (В.Лапаценка, гр. Б-32) філалагічнага факультэта. Розныя займальныя гульні дазволілі студэнтам вярнуцца ў “Маленькую краіну казак”, а конкурс “Скрытая камера” паказаў: не, не перавяліся яшчэ ў нас сапраўдныя беларускія вадзіцелі аўтамабіляў! Трыо дзяўчат у складзе Т.Парашчанка, В.Рысінай, М.Мяркулавай з філфака паказалі інсцэніраваны эпізод хакейнага матча ў алімпійскім Нагана. Выдатна справіўся з прапанаваным яму псіхалагічным тэстам выхавальнік інтэрната М.Бардашэвіч, які даказаў, што ў душы — ён сапраўдны студэнт! Першакурсніца матэматычнага факультэта Т.Маслава парадавала гасцей выкананымі песнямі — і вясёлымі, і пяшчотна-кранальнымі.

Увесь вечар з намі быў дыск-жакей С.Вартанян, трэцякурснік факультэта фізічнай культуры.

На вечары панавала цёплая, таварыская атмасфера. Бачна было, што ўсім тут весела і ўтульна. Свята прайшло пад дэвізам: “Как здорово, что все мы здесь сегодня собрались!”

Пасля вясёлых конкурсаў, гульняў усе маглі патанцаваць на дыскатэцы.

Асаблівую ўдзячнасць за аказаную дапамогу ў арганізацыі і правядзенні вечара выказваем аддзелу выхаваўчай работы, прафкому студэнтаў — за спонсарскую падтрымку.

**К.ЯНКОВА,**
**студэнтка 2-га курса філалагічнага факультэта.**

**Женские судьбы**

## П Р Е О Д О Л Е Н И Е

*Я часто вспоминаю ее. Особенно в те жизненные моменты, когда становится очень трудно и кажется, что нет выхода из сложившегося тупика. И память вновь возвращает меня в то лето...*

Теперь уже очень далекими кажутся те времена, когда с помощью профсоюза мы могли позволить себе провести отпуск за пределами Беларуси с ее чернобыльскими проблемами. Тогда мне повезло: попалась “горящая” путевка в Прибалтику. И вот я в санатории под Ригой. Места прекрасные, вокруг красивый лес, с черникой и малиной, недалеко — небольшое озеро, где можно искупаться, позагорать.

Размеренно потекли у всех приехавших сюда отпускные деньки. Днем — процедуры, лечение, вечером — женские посиделки на скамеечке на свежем воздухе, густо напоенном запахом сосны. Велись беседы о внезапно нахлынувших проблемах, связанных с обвальным повышением цен, с тревогами за здоровье после чернобыльской аварии...

Но вот в один из дней в эту привычную атмосферу вошло что-то тревожное, волнующее. В санатории появилось новое лицо. Но как появилось! С автобусной остановки, которая была рядом с главным корпусом, к нему двигалась молодая женщина со странными, непривычными, на первый взгляд, приспособлениями на ногах — какими-то замысловатыми металлическими конструкциями, которые помогали ей сохранять равновесие. Руками она опиралась на стальные палки, тоже имеющие какую-то необычность. Рядом с ней медленно шел молодой красивый мужчина, держа в руках дорожные сумки. Проводив взглядами, полными сочувствия и неподдельного интереса эту пару, отдыхающие зашушукались и стали высказывать свои предположения:

— Хотя и инвалид, а муж не бросил... Мужественный...

— Да, таких мужчин — сейчас мало...

А в последующие дни все могли видеть, как в строго определенное время, утром и вечером, та женщина, но уже без сопровождения, с упорством преодолевала отмеренный ею путь по асфальтированной дорожке — от жилого корпуса до растущего неподалеку красивого могучего дуба. Как тяжело давались ей эти несколько десятков метров! Но она терпеливо и настойчиво делала такие трудные для нее шаги... Сочувствие, с которым все взирали вначале на это преодоление себя, сменилось неподдельным восхищением этой хрупкой, но сильной духом молодой женщиной. И какими мелкими, что называется, не стоящими выеденного яйца, показались нам всем собственные проблемы! Когда она уставала, то садилась на скамеечку отдохнуть. А в знак поклонения перед человеком с неистребимой жаждой преодолеть свой недуг очень многие, кто возвращался с прогулки по лесу, на озеро, несли ей то букетик скромных цветов, то веточки черники и малины, усыпанные спелыми ягодами.

... В тот вечер я, зачитавшись интересной книгой, не заметила, как осталась на скамейке возле жилого корпуса одна. Услышала, как меня кто-то окликнул. Это была она. Извинившись, она попросила меня помочь ей добраться по ступенькам корпуса в ее комнату. Поддерживая женщину под руки, я довела ее домой. В комнате на первом этаже, где она жила, был идеальный порядок. С виноватой улыбкой она попросила меня посидеть с ней. И тут я увидела совсем еще молодое лицо. Это издали она казалась мне намного старше по возрасту.

Исповедь Лидии (так ее звали) передо мной открыла мне такую глубину человеческой трагедии, что в моем горле застрял колючий комок.

... Все у девушки складывалось хорошо. Закончила институт, работала на фабрике мастером в одном из городков Латвии, хотя сама родом с Украины. Но то летнее, солнечное утро, когда она шла на работу, все перечеркнуло в ее судьбе. Мчавшийся на большой скорости легковой автомобиль вдруг почему-то занесло на край тротуара, по которому шла Лида. Успела только почувствовать внезапную боль, а далее — пустота, пропасть. Сбитая “Жигулями” на полном ходу девушка осталась лежать на обочине дороги. Водитель трусливо удрал с места аварии. Потом были бесконечные больницы, клиники, операции, многочисленные консилиумы врачей-травматологов, нейрохирургов. Приехала к дочери из далекого украинского городка престарелая мать, чтобы помочь врачам выходить завернутое в сплошной гипсовый кокон молодое тело.

Виновника трагедии Лидии, которого потом разыскали, суд ... оправдал.

Казалось, что дальнейшая борьба за жизнь, за восстановление здоровья теряет дальнейший смысл, если торжествует ненаказанное зло. Отчаяние отбирало последние силы. Но, по счастливой случайности, обо всем, что случилось с Лидой, узнала журналистка местной газеты, после чего в ней появилась статья. Она то и расставила все по местам: после повторного судебного заседания шофер, нарушивший тогда правила дорожного движения, понес заслуженное наказание, а судьбой девушки заинтересовались добрые, отзывчивые, к тому же состоятельные люди. Бизнесмены, предприниматели предложили свою помощь — деньги на лечение, на путевку. Так Лида оказалась в санатории. И сопровождал ее сюда, кстати, не муж, как все думали вначале, а один из тех бизнесменов.

Беда не так горька, если рядом — надежное плечо, искреннее участие ближнего. И слава Богу, что встретились Лидии такие люди, которые помогли вернуть ей веру в справедливость и добро. А главное — в свое выздоровление.

Что я могла сказать тогда девушке, перенесшей так много в свои двадцать с небольшим лет? Только уверить, что у нее все будет хорошо, если самой не сдаваться, не падать духом. Легкое пожатие ее ладонью моей руки, вспыхнувшие искорки в красивых глазах Лиды были подтверждением тому, что так и будет.

... Прошли годы. А я до сих пор будто черпаю для себя силы в сложных жизненных ситуациях из образа той мужественной девушки, сумевшей преодолеть свои тяжелейшие проблемы.

**Т.ДУБЯК.**

Пра творчасць нашай выпускніцы

# ПАД ЗОРКАЙ ПАЭТЫЧНАГА ТАЛЕНТУ



... Калі нараджаецца на Зямлі сапраўдны Паэт, хтосьці ўсеўладны, які кіруе чалавечымі лёсамі, запальвае ў Сусвеце, як добры знак, новую зорку, святло якой разліваецца па неабсяжным начным небасхіле. Маленькая і, здавалася, нязвычная, сваёй таямнічай неразгаданасцю яна прыцягвае позіркі шматлікіх людзей, абцяжараных разнастайнымі клопатамі і праблемамі. Але гледзячы на яе, такую далёкую і прамяністую, кожны з нас забывае на пэўны час пра складанасці жыцця, уласныя памылкі і непрыемнасці і пачынае адчуваць сябе часцінкай вялікага і недасяжнага Сусвету. Менавіта таму ў самыя цяжкія хвіліны свайго жыцця ўглядаецца чалавек у зорнае неба, шукаючы адказы на спрадвечныя пытанні. Бо толькі яны, гэтыя неабдымныя, незвычайныя прыгожыя нябёсы, расшытыя, як бісерам, зоркамі, здольныя закрануць самыя таямнічыя струны чалавечай душы, прымусіць задумацца над супярэчлівымі лёсавызначальнымі праблемамі...

Як гэтыя зоркі, з'яўляюцца аднойчы ў паўсядзённым жыцці асаблівыя людзі, у сэрцы якіх гарыць нязгасны агонь Натхнення. Яны прыходзяць у наш складаны і недасканалы свет, каб дапамагаць і асвятляць дарогу іншым, прымаючы, як уласныя, чужыя беды і перажыванні, боль пакуты, бо нараджаюцца гэтыя людзі з незвычайна чуйнай душой Паэта...

Даволі рэдка ў сваім жыцці, заўсёды занятыя вырашэннем нейкіх уласных праблем, мы звяртаемся да Мастацтва, якое жывіць у чалавеку Духоўнасць, не дае амярцвець пачуццям. Таму кожнае сутыкненне з творчай асобай, а тым больш, сапраўдным паэтам, становіцца незвычайнай падзеяй, якая робіць наша штодзённае існаванне больш цікавым і разнастайным.

Менавіта такім святам нядаўна стала для нас, студэнтаў другога курса філалагічнага факультэта, сустрэча з беларускай паэткай Таісіяй Мельчанка, арганізаваная выкладчыкамі кафедры беларускай літаратуры. Вядомая паэтка наведала наш універсітэт, каб пазнаёміць будучых літаратуразнаўцаў са сваім апошнім зборнікам "Добры знак". Але найперш распавядала нам Таіса Васільеўна пра сваё жыццё.

Цікавая асоба, аўтар некалькіх паэтычных кніжак, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, яна нарадзілася і вырасла на Гомельшчыне, скончыла гісторыка-філалагічны факультэт нашай навучальнай установы, шмат гадоў настаўнічала ў школе, дорачы душэўную дабрыню і шчырасць сваім вучням, прывіваючы ім любоў і павагу да мовы продкаў. Зараз Таіса Мельчанка займаецца ўласнай творчасцю, удзельнічае ў разнастайных літаратурна-культурных праектах і мерапрыемствах, прыкладае намаганні, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да праблем захавання і развіцця роднай мовы і літаратуры.

І, канешне, на гэтай сустрэчы чытала паэтка ўласныя творы, раскрываючы ўсю складанасць і шматграннасць тэматыкі сучаснай беларускай паэзіі. У яе лірычных вершах гучыць сцвярджэнне незвычайнай знітаванасці чалавека з роднай зямлёй, трывога і неспакой за яе будучыню. Таму аўтарка імкнецца абудзіць нацыянальную самасвядомасць беларусаў і, уздымаючы праблему мовы, заклікае любіць і берагчы народную спадчыну. Несціханым болем адгукаюцца ў душы паэткі падзеі даўно мінулай вайны; вельмі хвалююць і лёсы, скалечаныя яшчэ і іншай трагедыяй Беларусі — чарнобыльскай бядой, якая, нібы чорным крылом, агарнула нашу радзіму.

Адной з вызначальных у сваёй творчасці лічыць Таіса Мельчанка праблему бездуxоўнасці, маральнай дэградацыі нашага грамадства, намагаецца зразумець яе вытокі і прычыны. Яна сцвярджае, што, толькі асэнсаваўшы сваё прызначэнне на Зямлі, чалавек зможа знайсці ўласнае месца ў вялікім Сусвеце. Раскрывае паэтка і ўнутраны свет лірычных герояў, складанасць і супярэчлівасць узаемаадносін і дачыненняў асобаў.

Вершы Таісы Мельчанка аказалі на прысутных вельмі моцнае ўражанне з-за сваёй сур'ёзнасці і глабальнасці праблематыкі. Яны падштурхнулі многіх да роздуму над няпростымі жыццёвымі пытаннямі, асэнсавання негатыўных з'яў у нашым грамадстве, прымусілі спачуваць і перажываць за яе лірычных герояў. Напэўна, гэта і ёсць сапраўднае прызначэнне Паэзіі.

І хочацца верыць, што "Добры знак" Таісы Мельчанка абавязкова знойдзе свой шлях да людскіх сэрцаў, здолее абудзіць і закрануць шчырыя чалавечыя душы. Трэба спадзявацца, што менавіта гэты паэтычны зборнік стане верным Добрым знакам для беларускага чытача, а зорка невычэрпнага таленту вядомай пісьменніцы будзе заўсёды гарэць на нашым літаратурным небасхіле.

**Святлана КАГАН,**
**студэнтка гр. БА-23**
**філалагічнага факультэта.**

# БЫВАЕ І Ў ПЛАНЕТ НАТХНЕННЕ...

***Вялікія людзі і героі найбольш поўна выяўляюць аблічча свайго народа, і імёны іх жывуць у стагоддзях.***

**Ж.Лафіт.**

Гомельская абласная бібліятэка часта праводзіць сустрэчы з цікавымі пісьменнікамі, паэтамі. Тут можна пачуць шмат новага, паглыбіць свае веды ў мастацтве, пазнаёміцца са славутымі пісьменнікамі, якія жывуць побач з намі, у нашым горадзе. На адной з такіх сустрэч пашанцавала пабыць і нам, студэнтам філалагічнага факультэта. Гэта была не звычайная сустрэча, а творчая вечарына, прысвечаная 60-годдзю Юрыя Сяргеевіча Фатнева.

Юрый Сяргеевіч нарадзіўся на Алтаі ў сям'і ваеннаслужачых. На долю гэтага чалавека прыйшлося шмат цяжкасцей: Вялікая Айчынная вайна, нялітасць урада, адмовы ў друку, частыя арышты. Шматшто звязвае пісьменнік з в. Старыя Дзятлавічы, куды пераехала сям'я Фатневых у 1941 годзе:

**И у планет бывает вдохновенье,**
**Но только длится вечность, а не миг,**
**Попробуйте найти произведенье**
**Светлей берез у Дятлович моих.**

Першы верш "Расія" з'явіўся ў газеце "Голас селяніна".

Ю.С.Фатнеў — не толькі цудоўны паэт, але і выдатны празаік. Ён выдаў 9 кніг: "Дзень прасвятлення", "Птушкі ночы", "Спявае ражок ля Сажа" і інш. Вядомыя такія яго раманы як "У рэха няма твару", "Славянская Біблія", "Базарны маэстра", а таксама зборнік міфаў "Язычніцкія сны". Але гэта далёка не ўсё, што напісана Юрыем Сяргеевічам. Ён лічыць сябе аўтарам ненадрукаваных кніг. Але мы спадзяемся, што ўсё ў пісьменніка яшчэ ў будучым.

Трэба сказаць, што Ю.С.Фатнеў добры мастак. На яго карціны нельга не звярнуць увагі. Яму належаць пейзажныя замалёўкі: "Чую музыку я ў фарбах гэтых", "Вулачка ў Добрушы", "Ля Іпуці", "За Навабеліцай", "Шэрань".

Цёплыя віншаванні і найлепшыя пажаданні прагучалі ў адрас юбіляра. Павіншаваць са святам майстра слова прыйшлі Рыгор Андрэявец, рэдактар часопіса "Палессе", у якім друкуюцца творы Юрыя Сяргеевіча, Юрый Максіменка, наш гомельскі паэт, артыстка філармоніі Людміла Шугалей, заслужаная артыстка БССР Галіна Паўлянок.

**Святлана ГУЛАК,**
**студэнтка гр. Р-11 філалагічнага факультэта.**



*Парады псіхолага — жанчынам*

# ТРЭБА ПАВАЖАЦЬ СЯБЕ

Неабходна ведаць, што наша самасвядомасць развіваецца на працягу ўсяго жыцця. Калі ў маладыя гады мы не адчувалі любві да сябе, веры ў асабістыя сілы, мы не павінны цягнуць гэты груз праз усё сваё жыццё. Пачуццё асабістай годнасці можна выхоўваць.

Як пазнаюць чалавека з пачуццём асабістай годнасці? Гэта той, хто паважае сябе, хто можа справіцца з усім, што сустрэнецца ў жыцці. Такі чалавек верыць у асабістыя сілы, здольны вучыцца, думаць, прымаць рашэнні, даваць ацэнку, спраўляцца з патрабаваннямі, прад'яўленымі жыццём.

## ШТО ПРЫНОСІЦЬ НАМ ШКОДУ?

Многія жанчыны пастаянна параўноўваюць сябе з іншымі. Так яны не могуць правільна ацаніць сябе, ступень іх самаацэнкі пастаянна вагаецца. Яны адчуваюць сябе больш упэўненымі, калі маюць справу з людзьмі, якія ім у чым-небудзь уступаюць. Калі ж яны самі з'яўляюцца больш слабейшымі, іх самапавага падае да нуля. Праблема ў тым, што яны ўвесь час супастаўляюць сябе з іншымі людзьмі і лічаць сябе ніжэй за іх.

Многія жанчыны, на жаль, няўмела ўспрымаюць пахвалу. На справядлівую ацэнку іх работы яны адказваюць: "Ах, аб гэтым не варта гаварыць", замест таго каб сказаць: "Мне вельмі прыемна гэта чуць ад вас". Калі такую жанчыну пахваляць за добрую работу, яна хутчэй адмахнецца, як быццам яна гэтага не заслужыла. Крытыку ж яна ўспрымае як належнае.

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ САМААЦЭНКІ

Жывіце сённяшнім. Будзьце актыўнай і таварыскай, не адгароджвайцеся ад свету і не адмаўляйцеся ад сваіх звычак.

З перасцярогай адносьцеся да ўсяго новага, не перажывайце за свае памылкі, ацаніце прызнанне вашых поспехаў іншымі. Умейце самі знаходзіць свае памылкі і выпраўляць іх.

Умейце даваць ацэнку сабе самі. Даруйце сабе памылкі і слабасці. Самаацэнка азначае, акрамя таго, уменне ўсведамляць свае асабістыя пачуцці і ўмець іх выказваць.

Умейце адказваць за свае ўчынкі. Хто ўмее гэта рабіць, шукае віну ў самім сабе, а не ў іншых, не імкнецца прыкрыцца адгаворкамі, вызваць да сябе спагаду або пакарыцца лёсу.

Самасцвярджайцеся. Будзьце гатовы абараняць асабістыя інтарэсы, перакананні, погляды. Жанчыны не заўсёды адважваюцца дакладна выказаць, чаго ім хочацца. Яны адчуваюць за сабой віну. Калі ім прыходзіцца сказаць "не", яны пазбягаюць канфліктных сітуацый, не хочуць нікога пакрыўдзіць або расчараваць. Пры гэтым важна навучыцца растлумачваць, чаму сказалі "не", і не трэба прасіць прабачэння.

Вызначце ў жыцці асноўныя мэты. Не спадзявайцеся ва ўсім на лёс або на волю выпадку. Не шукайце пастаянна тлумачэнняў вашай пасіўнасці або вашых няўдач. Корань самапавагі крыецца не ў поспеху, а ў няспыннай гатоўнасці ўсімі сіламі імкнуцца да пастаўленай мэты.

**(З "Кнігі для жанчын" Сабіны Хофман).**

*Мир цветов — мир прекрасный*

# РОЗА



Она — царица цветов. Ее любили, ей поклонялись, ее воспевали и прославляли. По древней персидской легенде роза — подарок Аллаха. К нему однажды явились все дети флоры и попросили назначить им нового повелителя вместо сонливого лотоса (нильской водяной лилии). Выслушав всех, Аллах дал им правительницей белую розу с охраняющими ее острыми шипами.

Роза сыграла заметную роль в истории культуры. Изображения роз, относящиеся к III тыс. до н.э., дошли до нас на дворцовых колоннах Вавилона и Ассирии. Из Передней Азии розу привезли в древнюю Грецию, где она была посвящена богине красоты Афродите.

Из Греции розу вывезли в Египет, где она становится символом роскоши. Во время пиров царицы Клеопатры лепестками роз устилали полы зала, гостей украшали венками из роз. Из лепестков готовили розовую воду, которую добавляли в вино и кушанья.

В эпоху расцвета Римской империи роза олицетворяла собой безумное расточительство. Миллиарды лепестков роз использовали не только во время пиров, но и увеселительных прогулок патрициев на галерах; ими усыпали поверхность озера или морского побережья. С падением Рима пришла в упадок и культура розы. Но уже в V и VI вв. розы снова выращивают в садах Европы. С конца XIX в. селекцию роз ведут почти во всех странах.

В Россию первая махровая роза была привезена в XVII веке царю Михаилу Федоровичу немецким послом.

В настоящее время мировой ассортимент роз насчитывает примерно 25000 сортов и форм. В центральном ботаническом саду Академии наук Республики Беларусь коллекция роз состоит из 830 сортов и 10 садовых групп. Для озеленения рекомендуется 90 сортов.

Букет роз — прекрасный подарок. Букет должен быть не слишком скудным, но и не чрезмерно большим. Количество цветков должно быть нечетным. Цветонос должен быть небольшим, с маленьким закрытым бутоном. Однако большим спросом пользуются розы с крупным "тяжелым" бутоном и длинным цветоносом.

Чаще всего розы дарят женщинам. Есть правила, связанные с цветовой символикой: красные розы выражают искреннее расположение, розовые считаются нейтральными и уместны в любой праздничной обстановке. Во все времена и у всех народов роза всегда означала любовь.

Молодым девушкам дарят нераскрывшиеся красные и розовые розы, молодой женщине — раскрывшиеся. Для невест букет составляют из цветов одной окраски — нежно-розовых, белых, причем букет тяжелым быть не должен. Юбиляру преподносят длинностебельные красные крупные розы, красиво оформленные корзины яркими розами. Главное — чтобы букет передавал искреннее расположение к человеку.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

*Улыбнитесь*

# "ЖЕНЩИНА ВСЕГДА ПРАВА"

Чем террористы отличаются от женщин?

Террориста легче убедить в его неправильных действиях.

☺☺☺

Чем отличается женщина от такси?

Женщина с огоньком не бывает свободна.

☺☺☺

Состоялся Всемирный конгрес женщин, на повестке дня которого были три вопроса:

Все мужчины сволочи.
Носить нечего.
Разное.

☺☺☺

Что нужно сделать мужчине, чтобы узнать все свои недостатки?

Жениться.

☺☺☺

— Вероятно, ночью будет буря, — говорит муж.

— Если вернешься домой вовремя — не будет, — уверенно отвечает жена.

☺☺☺



**--Сначала пусть Жучка попробует.**

☺☺☺

На серебряной свадьбе муж признается жене:

— А ты знаешь, дорогая, наш брак, в сущности, следствие ошибки.

— Как?! — восклицает жена.

— Да, представь себе. Ведь я тогда свистнул, чтобы остановить такси, а подошла ты...

☺☺☺

— Семейная жизнь, — говорит жена, — это постоянные жертвы! Я, например, каждый день готовлю еду!

— Совершенно верно, — соглашается муж. — А я ем то, что ты приготовила.



☺☺☺

Встречаются двое друзей. Один жалуется:

— Утром — дай денег, днем — дай денег, вечером — дай...

— А куда она их девает?

— А я что, даю?

☺☺☺

Жена обращается к мужу:

— Если я уйду к другому мужчине, ты же будешь жалеть!

— А чего мне жалеть чужого мужчину?

☺☺☺

— Сколько мне лет? Угадайте.

— Даже не могу себе представить.

— Ну, я вам намекну: моя дочь ходит в детский сад.

— Она там заведующая?

# УДАСТОЕНА ГАНАРОВАГА ДЫПЛОМА

У наш універсітэт на імя рэктара Л.А.Шамяткова прыйшло падзячнае пісьмо ад Беларускай экалагічнай партыі, у якім адзначаецца актыўны ўдзел выкладчыкаў ГДУ ў справе папулярызацыі экалагічных ведаў.

А лепшым выданнем выкладчыкаў універсітэта на названую тэму прызнана кніга дацэнта Л.П.Моладавай "Гульнёвыя экалагічныя заняткі з дзецьмі", якая напісана вельмі цікава, даступна для чытачоў рознага ўзросту і прафесій (настаўнікаў, работнікаў аховы прыроды, леснікоў і інш.). У конкурсе навукова-папулярных публікацый па экалогіі Беларусі, які праводзіўся Беларускай экалагічнай партыяй, Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, міністэрствамі лясной гаспадаркі, па надзвычайных сітуацыях, Беларускім таварыствам аховы прыроды, Л.П.Моладава заняла другое месца і ўзнагароджана ганаровым Дыпломам.

Варта дадаць, што за апошні час выйшла яшчэ адна, чарговая кніга гэтага аўтара — "Экалагічныя святы для дзяцей".

**Перасцярога**

# НА АКТУАЛЬНЫЯ ТЭМЫ

Крымінагенная абстаноўка ў нашай вобласці, у г.Гомелі застаецца пакуль што складанай, нягледзячы на ўсе прымаемыя праваахоўнымі органамі меры. Усё больш хвалюе грамадскасць, а таксама медыкаў рост колькасці інфіцыраваных вірусам СНІД. Таму не выпадкова гэтыя балючыя тэмы сталі прадметам размовы са студэнтамі эканамічнага факультэта начальніка аддзела па ахове грамадскага парадку і прафілактыкі правапарушэнняў УУС Гомельскага аблвыканкома А.Ц.Гаркова і ўрача паліклінікі N6 Т.Г.Каваленак.

**СТАНЬЦЕ СТРОЙНЫМІ І ПРЫВАБНЫМІ**

Запрашаем студэнтак у групу аэробікі.

За даведкамі звяртацца па тэл.53-73-49.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады ст.выкладчыка па кафедры геаэкалогіі.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 226699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Калектыў завочнага факультэта выказвае глыбокае спачуванне сакратару дэканата **ТАЛКАЧОВАЙ** Таццяне Маркаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 101.
Падпісана да друку 6.03.98.